З НАСТАЛЬГІЯЙ

# Дзядулевы сшыткі, маміна школьная сукенка, татава лагарыфмічная лінейка

**У СШ №1 імя Янкі Купалы працуе выстаўка «Сакрэты школьнага партфеля», для якой настаўнікі, вучні і іх бацькі сабралі рарытэты вучэбнага працэсу мінулага стагоддзя – ад пёравай ручкі з чарніліцай, сшыткаў і падручнікаў да парты.**

12 стар.




Фота: Аляксей ПЛАТКО.

Для Яны Гуско і яе бабулі Тамары Зімарынай гэты сшытак – дарагі ўспамін пра дзядулю, мужа Барыса Зімарына.

# Дзядулевы сшыткі, маміна школьная сукенка, татава лагарыфмічная лінейка

Пачатак на 1-й стар.

Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталля Вяршыцкая расказвае, што гэта ўжо сёмая тэматычная выстаўка. На мінулых дэманстраваліся калекцыі календароў, пласцінак, старадаўніх сервізаў, цацак... Ідэя сабраць рарытэты школьнай тэматыкі належыць дырэктару школы Васілію Маліноўскаму. Калегі з вучнямі яе падхапілі, увасобілі ў цікавую і пазнавальную экспазіцыю.

### Для чаго патрэбна прамакатка?

З самымі старадаўнімі і цікавымі экспанатамі нас пазнаёміла Марыя Буневіч, настаўніца гісторыі, якая адказвае за работу музея. Марыя Раманаўна сама закончыла гэту навучальную ўстанову ў 1990 годзе, у 2016-м выпускніцай стала яе дачка Агата, а летась у першы клас пайшоў сынок Ян. На вачах гісторыка мяняліся школьныя падручнікі, адыходзілі ў нябыт канцылярскія прынады і іншыя атрыбуты школьнага жыцця.

— Вось, глядзіце, гэта, ма-




Наталля Прудніkава прынесла на




**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ**

*Хто прыдумаў школьную парту?*

*Першую аднамесную школьную парту сканструяваў у 1870 годзе швейцарска-рускі вучоны заснавальнік навукі аб гігіене Фёдар Эрысман. У 1887 годзе ўдасканаліў канструкцыю, зрабіў яе двухмеснай, з адкідной стальніцай саслані на Урал студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта Пётр Караткоў. Ён працаваў настаўнікам у сельскай школе і прадставіў сваю парту на Урала-Сібірскай прамысловай выстаўцы, за што атрымаў дыплом, патэнт і быў удастоены сярэбранага медаля.*

быць, апошняя прамакатка ў школьным сшытку. Калі вучні пісалі чарнілам, яна была неабходная. А для цяперашніх дзяцей гэта рарытэт, — Марыя Раманаўна разгортвае сшытак Добрушскай папяровай фабрыкі, які яна захавала. – А вось мой дзённік за першы клас. Бачыце, настаўніца Вера Кузьмінічна Рубацкая ставіла нам адзнакі чырвоным стрыжнем, цяпер жа дазваляецца выкарыстоўваць толькі сіні і фіялетавы. З савецкіх часоў застаўся ў нашай сям'і мікракалькулятар. Вучням дзіўна, што ён такі вялікі і ўключаецца ў разетку.

Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Наталля Пруднікава прынесла на выстаўку атэстат сталасці сваёй бабулі Валянціны Шостак, якая закончыла СШ №1 у 1956 годзе. Цікава, што сярод прадметаў значыцца «Трыганаметрыя», а замест

**выстаўку атэстат сталасці сваёй бабулі за 1956 год.**

сённяшняга «здавальняюча» на той час пісалі «пасрэдна».

Побач з атэстатам размешчаны медалі — найвышэйшая ўзнагарода за старанную вучобу.

— Залаты медаль належыць Алене Пляшко, сястры майго мужа Аляксандра, — расказвае Марыя Раманаўна. — А сярэбраны прынесла настаўніца беларускай мовы Інеса Ліс. Ім была ўзнагароджана яе сястра Таццяна Карыцька.

## Старая парта – нібы машына часу

Хто б з дзяцей ці дарослых ні наведваў выстаўку, нязменна бярэ ў рукі сшыткі па пісьме і матэматыцы вучня 2 класа Барыса Зімарына, датаваныя 1958 годам. Нельга не здзівіцца, якія вялізныя літары выводзіў Барыс пер'евай ручкай у сшытку ў



**Школьная форма і партфель мінулага стагоддзя спадабаліся Мілане Кучко і Мацвею Субачу.**



**Марыя Буневіч расказвае Ксеніі Пудакевіч і Максіму Шчарбінскаму, як працуе калькулятар.**

касую лінейку. Такія на той час былі патрабаванні да правапісу. Пісаў Барыс надзвычай акуратна, за ўсе заданні — адны «пяцёркі». Сшыткі 65-гадовай даўніны прынесла на выстаўку першакласніца Яна Гуско. На жаль, дзядулі не стала ў 2009 годзе, для дзяўчынкі і яе бацькоў, для бабулі Тамары Зімарынай гэтыя сшыткі вельмі дарагія як напамін пра роднага чалавека, як прыклад вучнёўскай стараннасці.

Дзіўнай здаецца сённяшнім вучням капіравальная папера, ім цікава ўзяць яе ў рукі, пашапацець. Між іншым некаторыя дзяўчынкам-модніцам савецкіх часоў удавалася пафарбаваць такой паперай пасмачкі валасоў.

З цікавасцю разглядаюць дзеці празрыстыя трафарэты з літарамі, пры дапамозе якіх афармлялі насценгазеты, розную наглядную агітацыю. Прыцягваюць увагу касы для літар і лічбаў з кішэнькамі, драўляны пенал, у які назаўсёды ўеліся чарнільныя плямы. Дарэчы, сярод пеналаў ёсць і пластмасавыя, выробленыя на былым маладзечанскім радыёзаводзе «Спадарожнік». Іх фішка — табліца множання, уманціраваная ў верхнюю частку. А нам Марыя Раманаўна прадэманстравала работу рэдкага па цяперашніх часах савецкага прыбора для праверкі ў вучняў табліцы множання: пры правільным наборы лічбаў у ім загараецца лямпачка. Ёсць сярод экспанатаў і некалькі лагарыфмічных лінеек, з дапамогай якіх школьнікі выконвалі розныя матэматычныя вылічэнні. Карыстацца ёю даволі складана, сёння не кожны настаўнік матэматыкі старэйшага пакалення ўспомніць, як з ёю справіцца.



**Трэцякласнікам Лізе Вяршыцкай і Даніілу Ковелю цікава было пасядзець за старой школьнай партай.**

Гатавальні ў чорных аксамітных футлярах з хітрым замком (хто памятае, як рэйсфедэрамі ад іх дзяўчаты спрытна вышчыпвалі бровы?). Калекцыя школьных ранцаў, настаўніцкіх сакваяжаў, партфеляў, дыпламатаў. Карычневыя школьныя сукенкі з белым, святочным і чорным, паўсядзённым фартухамі. Наборы падручнікаў, пачынаючы з пасляваенных часоў. Вялікі Чырвоны Сцяг школы, на якім залатымі літарамі напісана «Слава Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». У 1990-м яго апошні раз выносілі на агульнашкольную лінейку. Як выдатна, што ўсё гэта захавалася і сённяшнія хлопчыкі і дзяўчынкі могуць гэта ўбачыць і лепш уявіць, як вучыліся іх бацькі, дзядулі і бабулі.

Многія класы пазнаёміліся ўжо з экспазіцыяй выстаўкі, якая працягнецца да канца навучальнага года. Марыя Буневіч падрыхтавала прэзентацыю, сабрала шмат цікавых фактаў пра школьнае жыццё мінулых стагоддзяў.

А на памяць аб выстаўцы ў многіх вучняў застануцца фотаздымкі за старой, але яшчэ моцнай школьнай партай, якую прадбачліва захавалі педагогі школы. Цяпер яна музейны экспанат. А для наведвальнікаў выстаўкі — нібы машына часу, якая пераносіць іх у мінулае стагоддзе...

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота: Аляксей ПЛАТКО.**